Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

## Складальнікі:

*А. М. Аляхновіч,* прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;

*В. А. Грачова,* дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

## Рэцэнзенты:

*У. А. Мішчанчук,* дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», прафесар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;

*І. А. Алексніна,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

## Рэкамендавана да зацвярджэння:

*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 28.08.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *І. В. Смяян*
Адказны за выпуск *А. М. Аляхновіч*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Методыка выкладання спецдысцыплін» уваходзіць у склад дысцыплін псіхолага-педагагічнай накіраванасці і абагульняе атрыманыя студэнтамі тэарэтычныя веды, надаючы ім практычную накіраванасць. З яе дапамогай студэнты рыхтуюцца да праходжання педагагічнай практыкі і ў далейшым – да іх дзейнасці ў якасці выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін у галіне мастацтва. Дыяпазон прафесійных функцый студэнтаў даволі шырокі: рэжысёры, стваральнікі, выканаўцы, даследчыкі, выкладчыкі, нарэшце, прапагандысты розных відаў мастацкай культуры. У межах кожнай з адзначаных функцый прысутнічае асветніцкі аспект. Такім чынам, дысцыпліна выступае адначасова як мэта і сродак выхавання, адукацыі і прафесійнага станаўлення студэнтаў.

Трэба адзначыць, што ў сучаснай сацыякультурнай прасторы педагагічная дзейнасць у сферы мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання ажыццяўляецца не толькі ў працэсе акадэмічнай вучэбна-выхаваўчай работы, але і ў межах адпачынкавай дзейнасці, што патрабуе адпаведных форм і метадаў выкладання.

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» з’яўляецца асноватворным звяном пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-выкладчыкаў у сферы абрадава-святочнай культуры.

*Мэта* дысцыпліны – падрыхтоўка студэнта да ажыццяўлення прадуктыўнай прафесійнай дзейнасці ў якасці выкладчыка спецдысцыплін.

*Задачы:*

– выхаванне гуманістычнай высокапрафесійнай асобы выкладчыка;

– развіццё ў студэнтаў зацікаўленасці ва ўдасканаленні асабістага педагагічнага майстэрства;

– фарміраванне ў студэнтаў ведаў аб сучасных дасягненнях і актуальных тэндэнцыях у сферы выкладання тэатральных і фальклорна-відовішчных спецдысцыплін і ўменняў іх практычнага выкарыстання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– стварэнне падстаў да ўзнікнення ў студэнтаў навыку прафесійных педагагічных зносін у сферы выкладання спецдысцыплін.

У выніку вывучэння прадмета «Методыка выкладання спецдысцыплін» студэнт павінен *ведаць*:

– характар уздзеяння творчых заняткаў тэатральна-відовішчным мастацтвам на асобу творцы;

– спецыфіку выкладання асобных прадметаў, што ўваходзяць у комплекс спецдысцыплін;

– педагагічныя прынцыпы і метады вучэбна-выхаваўчай і творчай работы з навучэнцамі рознага ўзросту;

– уклад вядомых дзеячаў тэатральнага мастацтва ў стварэнне сучаснай школы навучання сцэнічнаму майстэрству;

– прынцыпы планавання вучэбна-творчай работы ў розных формах навучання.

Студэнты павінны *ўмець:*

– вызначаць неабходны і дастатковы змест, эфектыўную методыку вучэбна-творчых заняткаў у залежнасці ад мэт, форм навучальнага працэсу і ўзросту навучэнцаў;

– карыстацца метадамі выяўлення індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей людзей рознага ўзросту для прадуктыўнага ўключэння іх у эстэтычную дзейнасць;

– кампетэнтна ставіць і вырашаць педагагічныя і выхаваўчыя задачы ў адносінах выканаўцаў і гледачоў пры ўвасабленні свята.

У працэсе выкладання дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя метады:

– тэхналогія вучэбнай дзейнасці, якая абапіраецца на рацыянальна-лагічныя і асацыятыўна-вобразныя спосабы засваення матэрыялу;

– інтэрактыўныя метады навучання (укараненне атрыманых ведаў у прафесійную дзейнасць, наладжванне зваротных сувязей, удасканальванне пазнавальнай і творчай дзейнасці);

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, мазгавы штурм, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

– гульнёвыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у крэатыўных, імітацыйных, ролевых, дзелавых гульнях і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойная работа студэнтаў можа быць выканана ў форме рэфератаў, эсэ, паведамленняў па прапанаванай тэматыцы. Таксама магчыма падрыхтоўка прэзентацый у адпаведнасці з тэматыкай вучэбных заняткаў па асобных прадметах. Самастойная работа мае на мэце распрацоўку зместу і методыкі заняткаў па асобных спецдысцыплінах, накіраваных на работу з навучэнцамі рознага ўзросту, а таксама на планаванне заняткаў у межах розных форм мастацкай адукацыі: акадэмічных, дасугавых, рэкрэацыйных.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне курса «Методыка выкладання спецдысцыплін» прадугледжана 106 гадзін, з якіх 54 – аўдыторных (10 гадзін – лекцыі, 44 гадзіны – практычныя заняткі).

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. зан. |
| *Уводзіны* | 2 | 2 | |
| *Тэма 1.* Спецыфіка свята (абраду). Асаблівасці прафесійных патрабаванняў да стваральнікаў у гэтым відзе творчасці | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Дзеячы тэатральна-відовішчных мастацтваў як аб'ект псіхолага-педагагічнага аналізу і ўздзеяння | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Узнікненне і развіццё тэорыі і практыкі навучання тэатральнаму мастацтву ў гісторыі замежнага і айчыннага тэатра. Нацыянальныя традыцыі падрыхтоўкі і правядзення абрадаў, свят, тэатралізаваных відовішч | 12 | 4 | 8 |
| *Тэма 4.* Дзейнасць вядомых тэатральных педагогаў як прыклад педагагічнага майстэрства | 6 | | 6 |
| *Тэма 5.* Дыягностыка і развіццё здольнасцей да творчасці ў галіне тэатральна-відовішчных мастацтваў | 6 | | 6 |
| *Тэма 6.* Змест і структура заняткаў тэатральным мастацтвам. Планаванне заняткаў | 2 | | 2 |
| *Тэма 7.* Дыдактычныя асаблівасці выкладання асобных тэатральных і абрадава-святочных дысцыплін | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Дзейнасць педагога па выхаванні і развіцці асобы ў тэатральным калектыве | 8 | | 8 |
| *Тэма 9.* Метады і сродкі фарміравання культуры ўспрымання тэатральнага (тэатральна-відовішчнага) мастацтва | 2 | | 2 |
| *Тэма 10.* Узроставыя асаблівасці ўспрымання, разумення мастацтва і тэатральна-сцэнічнай творчасці | 4 | | 4 |
| *Тэма 11.* Арганізацыя мастацка-творчых аглядаў, фестываляў, конкурсаў як педагагічны працэс | 2 | | 2 |
| *Тэма 12.* Прафесійнае майстэрства выкладчыка творчых спецдысцыплін | 2 | | 2 |
| Разам… | 54 | 10 | 44 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Сувязь курса «Методыка выкладання спецдысцыплін» з сацыяльнымі і псіхолага-педагагічнымі дысцыплінамі – гісторыяй, філасофіяй, сацыялогіяй, этыкай, эстэтыкай, псіхалогіяй. Месца дысцыпліны ў прафесійным станаўленні рэжысёра. Дысцыпліна ў кантэксце вывучэння абрадава-святочнай культуры беларусаў.

Скіраванасць падрыхтоўкі па дысцыпліне на праходжанне педагагічнай практыкі і (у далейшым) на практычнае ўвасабленне атрыманых ведаў і навыкаў.

### *Тэма 1.* Спецыфіка свята (абраду). Асаблівасці прафесійных патрабаванняў да стваральнікаў у гэтым відзе творчасці

Паліфанізм, сінтэтычны характар масавага святочна-абрадавага відовішча. Прафесійныя патрабаванні да стваральнікаў свята; шляхі фарміравання неабходных для прафесіянала якасцей. Псіхолага-педагагічныя аспекты ўзаемадзеяння прафесійных і непрафесійных выканаўцаў у працэсе стварэння і правядзення свята.

Тыпалогія абрадаў і свят, уласцівая сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, і характар прафесійных патрабаванняў да стваральнікаў масавага дзеяння.

Віды гульнёвай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе свят, іх псіхолага-педагагічны сэнс.

Умовы стварэння творчай групы. Методыка брэйнстормінгу як мадэль прадуктыўнай арганізацыі творчай групы і магчымасці яе выкарыстання пры падрыхтоўцы свята.

### *Тэма 2.* Дзеячы тэатральна-відовішчных мастацтваў як аб’ект псіхолага-педагагічнага аналізу і ўздзеяння

Асаблівасці тэатральна-відовішчных мастацтваў як віду мастацкай творчасці: сінтэтычны, калектыўны характар творчага працэсу; псіхафізічны апарат акцёра – асноўны «будаўнічы матэрыял» для стварэння вобраза; публічнасць творчага працэсу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– мастацтва, што існуе «тут і зараз». Амбівалентнасць уплыву гэтых фактараў на асобу дзеяча тэатральнага (тэатральна-відовішчнага) мастацтва.

Выхаваўчыя і развіццёвыя магчымасці заняткаў тэатральна-відовішчнымі відамі мастацкай творчасці. Імідж такіх заняткаў у сучасным сацыякультурным кантэксце.

## *Тэма 3.* Узнікненне і развіццё тэорыі і практыкі навучання тэатральнаму мастацтву ў гісторыі замежнага і айчыннага тэатра. Нацыянальныя традыцыі падрыхтоўкі і правядзення абрадаў, свят, тэатралізаваных відовішч

Гістарычная дынаміка дыферэнцыяцыі тэатральных прафесій. Падставы для ўзнікнення спецыяльнага навучання неабходным для сцэнічных выступленняў уменням. Паняцце прафесіяналізму на розных этапах развіцця тэатральна-відовішчных мастацтваў.

Станаўленне і развіццё тэатральнай педагогікі за мяжой: дасягненні і праблемы ў навучанні розным тэатральным прафесіям. Асаблівасці заходніх і ўсходніх тэатральных школ і выкарыстанне іх вопыту ў сучасным тэатральным працэсе.

Разнастайнасць форм тэатральных вучэбных заняткаў на беларускіх землях у часы Рэчы Паспалітай. Уплыў еўрапейскіх традыцый тэатральнай адукацыі XVII–XVIII стст. на стварэнне расійскай тэатральнай школы. Змест і методыка навучання асновам тэатральнага мастацтва ў сістэмах арыстакратычнай і прафесійнай адукацыі.

Савецкая тэатральная школа: дасягненні і праблемы. Станаўленне сістэмы тэатральнай адукацыі ў Беларусі.

Нацыянальныя традыцыі падрыхтоўкі і правядзення абрадаў, свят, тэатралізаваных відовішч. Уключэнне падрыхтоўкі рэжысёраў абрадаў і свят у сістэму прафесійнай мастацкай адукацыі.

## *Тэма 4.* Дзейнасць вядомых тэатральных педагогаў як прыклад педагагічнага майстэрства

Гуманістычная скіраванасць педагагічнай дейнасці М. С. Шчэпкіна, Я. Б. Вахтангава, М. О. Кнэбель.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прафесійнае майстэрства і педагагічная рэфлексія К. С. Станіслаўскага, Б. Я. Захавы, І. Э. Коха. Тэатральна-педагагічныя ідэі і вопыт Л. А. Сулержыцкага, М. А. Чэхава, В. Э. Меерхольда, У. І. Неміровіча-Данчанкі, А. В. Эфраса, Г. А. Таўстаногава. Уплыў тэатральных эксперыментаў Б. Брэхта і Е. Гратоўскага на айчынную артпедагогіку. Сучасныя дзеячы тэатральнай педагогікі М. А. Саснова, В. Фільшцінскі, якія ўвасабляюць новы погляд на заканамернасці тэатральна-педагагічнага працэсу.

Рэжысёрская, педагагічная, арганізацыйная дзейнасць стваральнікаў масавых свят І.Г.Шароева, І.Туманава, беларускіх майстроў гэтага творчага напрамку – М.І.Цэйцына, Г.В.Майзельса, А.А.Губанава і інш.

Метадычныя працы сучасных беларускіх тэатральных педагогаў – А.А. Каляды, А.А.Шагідзевіч і інш.

## *Тэма* 5. Дыягностыка і развіццё здольнасцей да творчасці ў галіне тэатральна-відовішчных мастацтваў

Структура агульных і спецыяльных здольнасцей чалавека. Прафесійныя патрабаванні да эмацыянальных, валявых, інтэлектуальных, крэатыўных якасцей тэатральнага дзеяча. Іх дыферэнцыяцыя ў залежнасці ад творчай прафесіі.

Узроставая дынаміка праяўлення схільнасцей і здольнасцей у сферы тэатральнага мастацтва.

Прыёмы дыягностыкі здольнасцей да творчасці ў галіне тэатральнага мастацтва ў залежнасці ад мэт мастацкай адукацыі.

Паняцце агульных і спецыяльных здольнасцей і іх праяўленне ў кантэксце тэатральных прафесій. Шляхі развіцця агульных і спецыяльных здольнасцей у працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін.

## *Тэма* 6. Змест і структура заняткаў тэатральным мастацтвам. Планаванне заняткаў

Варыятыўнасць зместу заняткаў тэатральным мастацтвам у залежнасці ад мэт мастацкай адукацыі: агульнае развіццё, прафесійная арыентацыя, прафесійнае навучанне.

Варыятыўнасць зместу заняткаў тэатральным мастацтвам у залежнасці ад узросту навучэнцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура і змест заняткаў з улікам узаемасувязі вышэйадзначаных варыянтаў. Прыкладнае планаванне вучэбных і творчых заняткаў у тэатральнай студыі.

## *Тэма 7.* Дыдактычныя асаблівасці выкладання асобных тэатральных і абрадава-святочных дысцыплін

Сістэма дыдактычных метадаў і яе функцыянаванне ў кантэксце выкладання асобных тэатральных дысцыплін.

Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па асноўных тэатральных дысцыплінах. Выкарыстанне мемуарнай, навукова-папулярнай, мастацтвазнаўчай, справачна-энцыклапедычнай літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў у працэсе выкладання спецдысцыплін. Асаблівасці работы з крыніцамі інфармацыі пры падрыхтоўцы абраду (свята) – дыдактычны аспект.

Формы арганізацыі заняткаў тэатральным мастацтвам: акадэмічныя і дасугавыя, традыцыйныя і ўласцівыя тэатральнай педагогіцы.

Праблема ацэнкі ў сістэме мастацкай адукацыі і шляхі яе вырашэння сродкамі тэатральнай педагогікі.

## *Тэма 8.* Дзейнасць педагога па выхаванні і развіцці асобы ў тэатральным калектыве

Этапы фарміравання творчага калектыву. Дзейнасць педагога па стварэнні ў калектыве спрыяльных умоў для творчага росту і самарэалізацыі асобы. Прыёмы стварэння творчага мікраклімату і эмацыянальна камфортнай сітуацыі. Праблемы творчага лідарства і міжасобасных канфліктаў, непазбежныя ў творчым калектыве.

Стылі педагагічнага ўзаемадзеяння і іх рэалізацыя ў тэатральнай педагогіцы. Педагагічныя аспекты паняцця «студыйнасць».

Выхаваўчыя функцыі рэпертуару. Педагагічныя патрабаванні да рэпертуару як сродку выхавання выканаўцаў і гледачоў. Размеркаванне роляў як педагагічная праблема.

Выяўленне і развіццё творчай індывідуальнасці вучня – асноўны напрамак дзейнасці тэатральнага педагога. Творчае прагназаванне як праблема артпедагогікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 9.* Метады і сродкі фарміравання культуры ўспрымання тэатральнага (тэатральна-відовішчнага) мастацтва

Публічнасць творчага працэсу як унікальная якасць, уласцівая тэатральнаму мастацтву. Праблема культуры ўспрымання тэатральнага відовішча публікай, што сфарміравалася ў сучаснай прасторы тэхнагеннай эстэтычнай інфармацыі. Успрыманне як сумесная творчасць.

Мэтазгоднасць педагагічнага курыравання асноўных этапаў успрымання: падрыхтоўчага, непасрэднага, замацоўваючага.

Прыёмы падрыхтоўкі публікі рознага ўзросту да ўспрымання тэатралізаванага відовішча. Спантаннасць успрымання масавага свята, узнікаючыя ў сувязі з гэтым эстэтычныя і педагагічныя праблемы. Узаемасувязь асветніцкіх і рэкрэацыйных элементаў у структуры свята.

Патрэба ў аналізе пабачанага як крытэтый культуры гледача. Прыёмы абмеркавання тэатральнага/тэатралізаванага відовішча з гледачамі розных катэгорый. Творчыя заданні як прадуктыўны сродак аналізу ўспрымання эстэтычных каштоўнасцей.

## *Тэма 10.* Узроставыя асаблівасці ўспрымання, разумення мастацтва і тэатральна-сцэнічнай творчасці

Асноўныя характарыстыкі якасці ўспрымання гледачамі тэатральнага відовішча: аб’ём і аб’екты ўвагі. Вастрыня ўспрымання і асаблівасці ацэнкі асобных элементаў тэатральнай выразнасці, разуменне ўмоўнасці, гумару і інш. Роля аб’ёму і якасці эстэтычнага вопыту ў фарміраванні адэкватнага ўспрымання.

Псіхолага-педагагічныя дэтэрмінанты ўзроставых асаблівасцей сцэнічнай творчасці. Выкарыстанне сучасных метадаў правядзення вучэбна-творчых заняткаў з выканаўцамі рознага ўзросту.

Педагагічнае кіраўніцтва творчым узаемадзеяннем выхаванцаў у рознаўзроставым калектыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 11.* Арганізацыя мастацка-творчых аглядаў, фестываляў, конкурсаў як педагагічны працэс

Поліфункцыянальнасць творчых форумаў, іх месца ў сучасным культурным жыцці краіны. Фестывалі і конкурсы як сродак папулярызацыі мастацтва і эстэтычнага выхавання публікі.

Шляхі павышэння прафесійнага ўзроўню ўдзельнікаў творчых спаборніцтваў. Сродкі стымулявання ўдзельнікаў да працягу і ўдасканалення творчай дзейнасці.

Мастацка-творчыя агляды, фестывалі, конкурсы як падстава да стварэння прасторы прафесійных зносін.

## *Тэма 12.* Прафесійнае майстэрства выкладчыка творчых спецдысцыплін

Мэта, задачы, функцыі выкладчыка спецдысцыплін і іх адрозненне ад аналагічных аспектаў творчай дзейнасці рэжысёра.

Педагагічнае майстэрства выкладчыка спецдысцыплін:

– гуманістычная скіраванасць дзейнасці тэатральнага педагога;

– валоданне тэарэтычнымі і практычнымі ведамі, уменнямі і навыкамі;

– педагагічныя здольнасці выкладчыка-майстра;

– валоданне сучаснымі тэхналогіямі выкладчыцкай і выхаваўчай дзейнасці.

Шляхі фарміравання і ўдасканалення педагагічнага майстэрства выкладчыкаў спецдысцыплін.

Навукова-даследчая работа як умова павышэння агульнага ўзроўню педагагічнага майстэрства выкладчыкаў спецдысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Аляхновіч, А. М.* Беларуская традыцыйная музычная спадчына / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Беларусь, 2000. – 384 с.

2. *Аляхновіч, А. М.* Народная песня ў школе / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 198 с.

3. *Аль, Д. Н.* Основы драматургии / Д. Н. Аль. – СПб. : СПбУКИ, 2005. – 280 с.

4. *Болбас, В. С.* Этычная педагогіка беларусаў / В. С. Болбас. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 175 с.

5. *Вишнякова, Н. Ф.* Основы педагогического мастерства / Н. В. Вишнякова. – Минск : Университетское, 2000. – 246 с.

6. *Грамовіч, І. М.* Методыка работы з фальклорным гуртам : курс лекцый / І. М. Грамовіч, Л. В. Снапкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 139 с.

7. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск : Ул. М. Скакун, 1999. – 256 с.

8. *Гуд, П. А.*Святы, якія заўжды з намі: гульнявыя праграмы «Ад Каляд да Пакроваў» / П. А. Гуд. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 224 с.

9. *Генкин, Д. М.* Массовые праздники / Д. М. Генкин. – М. : Просвещение, 1975. – 140 с.

10. *Гринер, В. А.* Ритм в искусстве актера / В. А. Гринер. – М. : Просвещение, 1996. – 135 с.

11. *Ершов, П. П.* Режиссура как практическая психология / П. П. Ершов. – М. : Искусство, 1972. – 352 с.

12. *Захава, Б. Е.* Мастерство актера и режиссера / Б. Е. Захава. – 4-е изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1978. – 334 с.

13. *Земляробчы* каляндар (абрады і звычаі) / скл. А. І. Гурскі, А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

14. *Кнебель, М. О.* Поэзия педагогики. О действенном анализе пьесы и роли / М. О. Кнебель. – М. : ГИТИС, 2005. – 576 с.

15. *Кристи, Г. В.* Воспитание актеров школы Станиславского / Г. В. Кристи. – 2-е изд. – М. : Искусство, 1978. – 430 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. *Кох, И. Э.* Основы сценического движения / И. Э. Кох. – М. : Просвещение, 1975. – 512 с.

17. *Козлянинова, И. П.* Сценическая речь : учеб. пособие для театр. и культ.-просвет. учеб. заведений и ин-тов культуры / И. П. Козлянинова. – М. : Просвещение, 1976. – 336 с.

18. *Малахова, И. А.* Развитие креативности личности в социокультурной сфере : педагогический аспект / И. А. Малахова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2006. – 327 с.

19. *Марков, О. И.* Сценарно-режиссерские основы художественно-педагогической деятельности клуба / О. И. Марков. – М. : Просвещение, 1988. – 158 с.

20. *Морозова, Г. В.* Пластическое воспитание актера / Г. В. Морозова. – М. : ТерраСпорт, 1998. – 239 с.

21. *Рубб, А. А.* Тайна режиссерского замысла / А. А. Рубб. – М. : МАПОМТПП, 1999. – 100 с.

22. *Чечётин, А. И.* Искусство театрализованных представлений / А. И. Чечётин. – М. : Сов. Россия, 1988. – 136 с.

23. *Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений / И. Г. Шароев. – М. : ГИТИС, 1992. – 480 с.

24. *Эфрос, А.* Профессия : режиссер / А. Эфрос. – М. : Парнас, 1993. – 368 с.

*Дадатковая*

1. *Агляд* асноўнай літаратуры па музычным фальклоры Беларусі / уклад. А. М. Аляхновіч. – Мінск : Мінскі ін-т культуры, 1990. – 18 с.

2. *Аляхновіч, А. М.* Беларускі музычны фальклор / А. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 336 с.

3. *Аляхновіч, А. М.* Фальклор у выхаванні школьнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 198 с.

4. *Аляхновіч, А. М.* Народная песня ў мастацкай самадзейнасці / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1991. – 112 с.

5. *Анализ* и интерпретация произведения искусства : учеб. пособие / Н. А. Яковлева, Е. Б. Мозговая, Т. П. Чаговец [и др.]; под ред. Н. А. Яковлевой. – М. : Высш. шк., 2005. – 551 с. : ил.

6. *Баравік, Р. І.* Рэжысура Беларусі : праблемы канцэптуальнасці спектакляў / Р. І. Баравік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – 143 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Беларуская* народная музыка / уклад. А. М. Аляхновіч. – Мінск : Мінскі ін-т культуры, 1992. – 20 с.

*8. Беларускі* дзіцячы фальклор / уклад. А. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – 272 с.

*9. Бруссер, А. М.* Основы дикции : практикум / А. М. Бруссер. – М., 2005. – 100 с.

*10. Веснавыя* святы / уклад. А. М. Аляхновіч, А. Ю. Лозка. – Мінск : Беларусь, 2000. – 160 с.

*11. Викторов, А. В.* Начинаем эстрадный концерт / А. В. Викторов. – М. : Знание, 1974. – 47 с.

*12. Владимирова, З. В.* М. О. Кнебель / З. В. Владимирова. – М. : Искусство, 1991. – 286 с.

*13. Гончаров, А.* Мои театральные пристрастия. Кн. 1. Поиски выразительности / А. Гончаров. – М. : Искусство, 1997. – 334 с.

*14. Гончаров, А.* Мои театральные пристрастия. Кн. 2. Выразительность в поиске / А. Гончаров. – М. : Искусство, 1997. – 205 с.

*15. Добрев, Ч.* Мир драмы / Ч. Добрев. – М. : Искусство, 1983. – 325 с.

*16. Ершов, П.* Технология актерского искусства / Л. Ершов. – М. : ВТО, 1959. – 308 с.

*17. Ершова, А. П.* Режиссура урока, общения и поведения учителя / А. П. Ершова, В. М. Букатов. – М. : Флинта, 2010. – 344 с.

*18. Завадский, Ю. А.* Об искусстве театра / Ю. А. Завадский. – М. : ВТО, 1965. – 348 с.

*19. Захава, Б. Е.* Современники / Б. Е. Захава. – М. : Искусство, 1969. – 391 с.

*20. Иллюстрированная* история мирового театра / под ред. Д. Р. Брауна. – М., 1999. – 582 с. : ил.

*21. Каляда, А. А.* Сцэнічная мова / А. А. Каляда. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 270 с.

*22. Колчеев, Ю. В.* Театрализованные игры в школе / Ю. В. Колчеев, Н. М. Колчеева. – М. : Школьная пресса, 2000. – 96 с.

*23. Конаржевский, Ю. А.* Анализ урока / Ю. А. Конаржевский. – М. : Педагогический поиск, 2003. – 336 с.

*24. Костюк, Е. Б.* Популярные музыкальные направления и жанры XX века : джаз, мюзикл, рок-музыка, рок-опера / Е. Б. Костюк. – СПб. : СПбГУП, 2008. – 196 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

25. *Мароз, В. П.* Асаблівасці рэжысуры дзіцячага свята ў школе / В. П. Мароз. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1997.

26. *Немирович-Данченко, В. И.* О творчестве актера : хрестоматия / В. И. Немирович-Данченко. – М. : Искусство, 1984. – 623 с.

27. *Севостьянов, А. И.* Общая и театральная психология : учеб. пособие для студентов вузов / А. И. Севостьянов. – СПб. : КАРО, 2007. – 256 с.

28. *Система* эстетического воспитания школьников / под ред. С. А. Герасимова. – М. : Педагогика, 1983. – 264 с.

29. *Соловьева, И. Н.* К. С. Станиславский / И. Н. Соловьева, В. В. Шитова. – М. : Искусство, 1985. – 169 с., ил.

30. *Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1983. – 424 с.

31. *Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Вагриус, 2000. – 448 с.

32. *Станиславский, К. С.* Работа актера над собой / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1985. – 479 с.

33. *Таиров, А. Я.* Записки режиссера. Статьи. Беседы. Речи. Письма / А. Я. Таиров. – М. : ВТО, 1970. – 602 с.

34. *Театр,* где играют дети / под ред. А. Б. Никитиной. – М. : ВЛАДОС, 2001. – 288 с.

35. *Товстоногов, Г. А.* Зеркало сцены / Г. А. Товстоногов. – Л. : Искусство, 1980. – Кн. 1 : О профессии режиссера. – 303 с. : ил.

36. *Толстых, А. В.* Искусство понимать искусство / А. В. Толстых. – М. : Педагогика, 1990. – 160 с. : ил.

37. *Хализев, В.* Драма как род искусства / В. Хализев. – М. : Искусство, 1978. – 240 с.

38. *Чехов, М. А.* Литературное наследие : в 2 т. – М. : Искусство, 1986. – Т. 2 : Об искусстве актера. – 588 с.

39. *Чурилова, Э. Г.* Методика и организация театрализованной деятельности дошкольников и младших школьников : программа и репертуар / Э. Г. Чурилова. – М. : ВЛАДОС, 2001. – 159 с.

40. *Шангина, Е. Ф.* Выявление и развитие актерских и режиссерских способностей / Е. Ф. Шангина. – М., 1993. – 160 с.

41. *Энциклопедический* словарь юного зрителя. – М. : Педагогика, 1989. – 418 с.

42. *Эфрос, А.* Репетиция – любовь моя / А. Эфрос. – М. : Парнас, 1993. – 318 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Ацэнка ў балах | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Распазнаванне асобных аб'ектаў вывучэння з вучэбнага матэрыялу, прад'яўленых у гатовым выглядзе: фактаў, тэрмінаў, псіхолага-педагагічных з'яў і інш. |
| 2 (два) | Адрозненне аб'ектаў вывучэння, прад'яўленых у гатовым выглядзе; разуменне адрозненняў паміж асобнымі з'явамі, працэсамі, уласцівасцямі |
| 3 (тры) | Узнаўленне часткі праграмнага матэрыялу: фрагментарны пераказ і пералік аб'ектаў вывучэння без разумення сутнасці з'яў |
| 4 (чатыры) | Недастаткова асэнсаванае прыпамінанне большай часткі праграмнага матэрыялу: апісанне аб'ектаў вывучэння з элементамі тлумачэння, што раскрываюць структурныя сувязі і адносіны паміж псіхалагічнымі ці педагагічнымі з'явамі (паасобку). Наяўнасць адзінкавых істотных памылак |
| 5 (пяць) | Асэнсаванае прыпамінанне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу: апісанне аб'ектаў вывучэння з тлумачэннем структурных сувязей і зносін паміж псіхалагічнымі ці педагагічнымі з'явамі (паасобку). Наяўнасць нязначных памылак |
| 6 (шэсць) | Поўнае веданне і асэнсаваны пераказ усяго праграмнага матэрыялу. Валоданне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі: прывядзенне прыкладаў з практыкі, выкананне практыкаванняў, задач і заданняў па ўзору |
| 7 (сем) | Поўнае, трывалае, грунтоўнае веданне і пераказ праграмнага матэрыялу. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне псіхалагічных ці педагагічных з'яў, працэсаў і ўласцівасцей паасобку і ў простых выпадках узаемасувязей; раскрыццё іх сутнасці, абгрунтаванне і доказ без выкарыстання прыкладаў з творчай практыкі, фармуляванне высноў. Недастаткова самастойнае выкананне заданняў для самастойнай работы студэнтаў. Наяўнасць адзінкавых нязначных памылак |
| 8 (восем) | Поўнае, трывалае, грунтоўнае веданне і пераказ праграмнага матэрыялу. Асэнсаванае карыстанне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё іх псіхолага-педагагічнай і метадычнай сутнасці, абгрунтаванне і доказ, падтрыманыя аргументамі і фактамі; фармуляванне высноў. Няўпэўненае вызначэнне сувязей паміж псіхолага-педагагічнымі навукамі і творчай практыкай. Самастойнае і своечасовае выкананне заданняў. Наяўнасць адзінкавых нязначных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Поўнае, трывалае, грунтоўнае, сістэмнае веданне праграмнага вучэбнага матэрыялу і перакананальны яго пераказ. Карыстанне праграмным вучэбным матэрыялам у часткова зmененай сітуацыі: прымяненне вучэбнага матэрыялу як на аснове вядомых правіл, прадпісанняў, так і пошук новых ведаў, спосабаў вырашэння пастаўленых задач; вылучэнне навуковых меркаванняў і гіпотэз, вылучэнне задач навуковага пазнання, наяўнасць дзеянняў і аперацый творчага характару для выканання заданняў. Доказнае вызначэнне сувязей паміж псіхолага-педагагічнымі навукамі і мастацка-творчай практыкай |
| 10 (дзесяць) | Свабоднае карыстанне праграмным вучэбным матэрыялам. Прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай сітуацыі: самастойнае апісанне, тлумачэнне псіхолага-педагагічных з’яў (паасобку і ва ўзаемасувязі). Фармуляванне правіл, падыходаў, кірункаў сучасных псіхолага-педагагічных навук; пабудова алгарытмаў для выканання заданняў, абгрунтаванне магчымых спосабаў вырашэння прафесійных псіхолага-педагагічных праблем. Выкананне творчых і даследчых работ і заданняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэдактар І. В. Смяян
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,09. Ул.-выд. арк. 0,69. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ